Азарка, В.У. Моўныя сродкі выражэння катэгорыі часу ў зборніку Максіма Багдановіча “Вянок” / В.У.Азарка // Мастацкі свет Максіма Багдановіча: адметнасць, шматграннасць, універсальнасць: зб.навук.арт. / Бел. дзярж. дед ун-т імя М.Танка.– Мінск: БДПУ, 2012.– С.9-13.

# Моўныя сродкі выражэння катэгорыі часу ў зборніку Максіма Багдановіча “Вянок”

В.У.Азарка
(БДПУ, Мінск)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На сучасным этапе развіцця лінгвістыкі і літаратуразнаўства цяжка ўявіць сабе аналіз і інтэрпрэтацыю мастацкага тэксту без даследавання тэмпаральнай структуры, якая ў значнай ступені вызначае ідыястыль таго ці іншага пісьменніка.

Час – феномен надзвычай абстрактны, яго нельга ўбачыць ці пачуць, далучыцца да яго таямніцы можна толькі праз мову. «Без языка время навсегда осталось бы лишь сопутствующим устройству мира физическим обстоятельством. Вербальное осознание времени обогащает ценностный компонент картины мира», – сцвярджае Н.К.Рабцава [1, с. 94]. Моўная рэпрэзентацыя часу, як і любога іншага абстрактнага паняцця, ажыццяўляецца перш за ўсё праз метафару. У зборніку Максіма Багдановіча “Вянок” знайшла сваё адлюстраванне базавая метафара “Час – гэта рух”: *дні ідуць, праходзяць годы* [2, с. 75], *плывуць гады ў даль* [2, с. 87], *а час усё каціўся далі* [2, с. 114].

Уласныя адносіны да часу паэт выказаў у радках, якія сталі крылатымі: *Жывеш ня вечна, чэлавек, – // Пераживі-ж у момэнт век!* [2, с. 76].

Лексічных адзінак, якія прызначаны называць часавыя адзінкі ці няпэўныя адрэзкі часу, намі выяўлена не вельмі многа, акрамя згаданых вышэй лексем *момэнт і век*, у зборніку “Вянок” ужытыя словы *час, пара, гады, сталецці, часіны, чэрэда гадзін*. Як бачым, канкрэтнае, дакладнае вымярэнне часу для прааналізаваных твораў Максіма Багдановіча не ўласціва.

Адной з агульназначных уласцівасцей часу з’яўляецца яго незваротнасць, скіраванасць ***з мінулага →у сучаснасць →у будучае***. Аднак погляд лірычнага героя вершаў Максіма Багдановіча скіраваны пераважна ў мінулае, згадаем, напрыклад, вершы “Возера”, “Летапісец”. “У вёсцы”, “Тэрціны”, “Вэроніка” і інш. У вершах мы можам сустрэць лексемы *мінулае, прошлае, былое,* у адрозненне ад слоў са значэннем ‘тое, што будзе’, якія ў зборніку не сустракаюцца. Невыпадкова, на нашу думку, назвы чатырох з васьмі частак зборніка маюць маркёры прошлага часу – “У зачараваным царстві”, “Згукі Бацькаўшчыны”, “Старая Беларусь”, “Старая Спадчына”.

У кожным вершы чытач сустракаецца з непаўторным вобразам свету, у якім паэт увасабляе сваё ўспрыманне пэўнага моманту жыцця, пэўнай

сітуацыі. Створаная пісьменнікам карціна часу можа быць як аб’ектыўнай, так і суб’ектыўнай.

Асноўным спосабам афармлення аб’ектыўнага мастацкага часу з’яўляюцца асабовыя і безасабовыя формы дзеясловаў цяперашняга і будучага часу 3-яй асобы адзіночнага ці множнага ліку, а таксама формы прошлага часу.

Аб’ектыўны час адрозніваецца праспекцыяй – гэта значыць, што дзеянне разгортваецца з мінулага ў сучаснасць або з сучаснасці ў будучае: *Сівавусы, **згорблены**, я **залег** між цінай, // І гадамі **грэюся** – **сплю** на дне рэкі* [2, с. 12]; *Дробны дождж **сячэ, ліецца**; // Вецер злосна ў хату **рвецца**, // У полі стогнам **аддаецца**, // **Стукне** ў дзверы і вакно; – // Сэрца беднае **заб’ецца** // І адразу ў ім **прачнецца**, // І адразу **скалыхнецца** // Усё што **згінула даўно*** [2, с. 75]. У першым прыкладзе кропка адліку знаходзіцца ў мінулым і дзеянне скіравана з мінулага ў сучаснасць; у другім – кропка адліку знаходзіцца ў сучаснасці, дзеянне скіравана ў будучае, аднак лінейнасць яго парушана зваротам у мінулае.

Кропкі адліку аб’ектыўнага мастацкага часу могуць маркіравацца па-рознаму: у прааналізаваных вершах Максіма Багдановіча найчасцей з гэтай мэтай выкарыстоўваюцца назоўнікі і прыслоўі з часавым значэннем: *ноч, восень, днём, даўно, даўно-даўно, калісь, тады* і інш. Лічэбнікі ў якасці маркёраў часу ў зборніку “Вянок” сустракаюцца вельмі рэдка, хаця менавіта яны дапамагаюць падкрэсліць дакладнасць, аб’ектыўнасць аповяду: *І бачу я ў канцы няхітрую прыпіску, // Што “кнігу гэтую, раб Божы, дзяк Гапон // Дзеля душы спісаў у месту Ваўкавыску у рок **сем тысяч сто васьмы** с пачатку дзён”* [2, с. 44]; *… свой век канчаю я ў манастырскіх мурах і пільна летапісь **другі** ўжо год пішу …*[2, с. 41]; *Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі, // Над хвалямі сінеючага Ніла // Ўжо **колькі тысяч** год стаіць магіла…* [2, с. 92].

Спалучэнне дзеяслоўных формаў цяперашняга, прошлага і будучага часу дапамагаюць Максіму Багдановічу адлюстроўваць рэальны мастацкі час ў дынаміцы і статыцы.

Як адзначаюць даследчыкі, сюжэтны час, характарызуючы дынамічную сітуацыю, абазначае падзеі, абмежаваныя пачаткам і/ці канцом, паказвае на хуткі тэмп іх поўнай ці частковай зменлівасці, на аднакратнасць, імгненнасць дзеяння, яго поўнае спыненне ці вынік падзеі ў сучаснасці [3, с. 172]. Асноўнай формай сюжэтнага часу з’яўляюцца дзеясловы прошлага часу закончанага трывання, а таксама формы будучага простага і будучага пачатку, састаўныя дзеяслоўныя і іменныя выказнікі, формы цяперашняга часу, ужытыя са значэннем намеру выканаць дзеянне, і цяперашняга гістарычнага: ***Змоўк** песьняр, **затаіў** свае шчырыя песні, // Ен іх болі ужо **не пяе*** [1, с. 60], ***Упалі** з грудзей Пана Бога, // **Парваўшыся**, пацеркі зор. // Яны **раскаціліся** ў небі, // **Усыпалі** сіні прастор …* [2, с. 61]. Удакладняюць значэнне сюжэтнага часу прыслоўі-інтэнсіфікатары: ***раптоўна** крык дзяцёнка **пачуўшы, дрогнуў** я і **агледзеўся*** [2, с. 108].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Несюжэтны час абазначае працягласць, працэсуальнасць, незакончанасць дзеяння, якое магло адбывацца ў мінулым, у сучаснасці ці ў будучым. Адлюстраванне дзеяння ў статыцы дапамагае паэту ствараць пейзажы, партрэты, адлюстроўваць пастаянныя ці цыклічныя з'явы:

*Вечэр на захадзе ў попелі* ***тушыць***
*Кучу чырвоных кавалкаў вугля;*
***Ціха*** *ўсё; вецер лістка* ***не зварушыць,***
***Не скалыхнуцца*** *ні траўкай паля;*
*Цёмныя цені* ***даўжэй*** *у лагчыне,*
*Птушкі прыстаўшай* ***марудней*** *палёт;*
*Сумна* ***плыве*** *маладзік бледна-сіні…*
*У небі вячэрнім, зялёным, як лёд;*
***Іскрацца*** *зорак сьняжынкі маркотна,*
*Збожжэ* ***пакрылося*** *шызай расой…* [2, с. 22].

Як бачым, для абазначэння несюжэтнага часу Максім Багдановіч шырока ўжывае дзеясловы цяперашняга, прошлага, будучага часу незакончанага трывання, а таксама іменныя выказнікі. У якасці інтэнсіфікатараў несюжэтных дзеясловаў паэт выкарыстоўвае прыслоўі ***ужо, цяпер: Ужо*** *імгла наж зямлёю лажыцца, // Чорнай рызай усё пакрывае, // Пылам зор небасхіл абсевае* [2, с. 21]; ***Цяпер*** *давольна топкае багно // Гніль сотні год збіраючы, яно // Смуроднай жыжкаю узгадавала цьвятоў расістых чыстую красу* [2, с. 93].

Аб'ектыўны мастацкі час уключае ў сябе і цыклічны час, што называе цыклы, якія звязаны са з'явамі прыроды ці прадстаўляюць "жыццёвае кола чалавека".

Аналіз вершаў са зборніка "Вянок" дазволіў выявіць шэраг слоў (лічбамі абазначана частотнасць іх ужывання), якія могуць быць аб'яднаны ў семантычнае поле "Цыкл". Ядро складаюць назоўнікі-назвы пор года (*вясна* - *7, лета* - *3, восень* - *1*), частак сутак (*дзень* - *8, ноч* - *8, вечар* - *7, золак, ранак*), а таксама прыметнікі і прыслоўі, утвораныя ад пералічаных слоў (*асенні/васенны* - *5, зімовы* - *3, начны, вясенні, летні; ноччу* - *4, к ночы, у поўначы, днём, восенню*). У цэнтры поля знаходзяцца словы, звязаныя па сэнсе з паняццем пэўнага цыкла, перш за ўсё гэта назоўнікі – назвы крыніц святла: *зоркі* - *9, месяц/маладзік* - *5, сонца* - *2, зара-зараніца, газьніца, сьвечка, ліхтарняў свет*. На перыферыі поля размешчаны словы, якія называюць з'явы, характэрныя для пэўнага цыкла (гэтыя з'явы характарызуюцца нерэгулярнай паўтаральнасцю): *снег, марозная.*

Касмалагічныя паняцці *пара, час* маюць дачыненне не толькі да прыродных з'яў, але звязаны і з этапамі жыцця чалавека, што дазваляе Максіму Багдановічу праз апісанне з'яў прыроды адлюстроўваць стан лірычнага героя, яго радасць ці смутак, звязаныя з пераходам з аднаго жыццёвага этапа на другі, асэнсоўваць праблему жыцця і смерці.

Фізіялагічны і сацыяльны час у зборніку "Вянок" афармляюць словы са значэннем "Этапы жыцця чалавека": *жыццё – смерць, дзіцячыя гада – захад жыцця, дзяўчынка – дзяўчына – паненкі – маладзіца, дзяцёнак – хлопчык –*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*хлопец – мужчына*, прыметнікі *мала*ды, *стары*, прыслоўі са значэннем перыядычнасці часу *гадамі, зноў*.

Праз выкарыстанне сінтаксічна-кампазіцыйнага прыёму паралелізму паэт нярэдка суадносіць два цыклічныя светы – Прыроду і Жыццё чалавека, згадаем вершы "С.Е.Палуяну", "Каганцу" "Зразаюць галіны таполі адну за адной" і інш.

Калі мастак слова выяўляе свае разуменне адносін паміж з'явамі, ён можа адлюстроўваць свет прыблізна, са змяшчэннем у часе і прасторы. Аднак калі індывідуальная карціна свету не парушае асноўных заканамернасцей, то даследчыкі і ў гэтым выпадку лічаць час рэальным, але суб'ектыўным (канцэптуальным) [3, с. 196]. Мастацкія тэксты з суб'ектыўным часам пабудаваны ад першай асобы і характарызуюцца ацэначнасцю, шырокім выкарыстаннем ментальных дзеясловаў, дзеясловаў пачуццёвага ўспрымання і дзеясловаў са значэннем эмацыянальнага стану, ужытых у форме прошлага, цяперашняга і будучага часу:

*І **ўспомніў** я **час**: срэдзь **восеннай** нахмурэнай **ночы***
*Музыка **зайграла**, агні ў вышыні **запылалі**,*
***Удыхалі** грудзі шырока, **свяціліся** вочы…*
*Мы к сьветлу **ўзляцелі** … і шкло ўкруг **напаткалі*** [2, с. 53].

*Моцна **кахаў** я цябе, дарагая,*
*Але **разстацца** нам **час**.*
***Буду** ў далёкім краю я **нудзіцца***
*У сэрцы любоў **затаіўшы** сваю;*
*Кожную ночку на зорку **дзівіцца***
***Буду** ў далёкім краю* [2, с. 33].

Спецыфічнасць успрымання часу пісьменнікам, яго светапогляд заўсёды абумоўліваюць адметнасць рэпрезентацыі катэгорыі тэмпаральнасці ў мастацкім тэксце. Уяўленне аб катэгорыі часу склалася гістарычна. Моўныя сродкі прадстаўлення гэтай катэгорыі ў мове з цягам часу змяняюцца (скарацілася колькасць аналітычных формаў, мадыфікаваліся часавыя значэнні розных часцін мовы, перш за ўсё дзеясловаў і прыслоўяў). Аналіз лексічных і граматычных сродкаў выражэння катэгорыі часу ў зборніку "Вянок" дапамагае зафіксаваць моўныя сродкі рэпрэзентацыі часу, якія ўжываліся ў мастацкіх тэкстах пачатку XX стагоддзя, выявіць асаблівасці арганізацыі твораў Максіма Багдановіча – аднаго з самых таленавітых прадстаўнікоў свайго пакалення, – што ў сваю чаргу садзейнічае раскрыццю адметных рыс ідыястылю гэтага мастака слова.

Літаратура

1. Рябцева, Н.К. Аксиологические модели времени / Н.К.Рябцева // Логический анализ языка. Язык и время.– М.: Индрик, 1997. – 351 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Багдановіч М. Вянок: Кніга выбраных вершаў / М.Багдановіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2011. – 120 с. (Факсімільнае выданне)
3. Папина, А.Ф. Текст: его единицы и глобальные категории / А.Ф.Папина.– Едиториал УРСС, 2002. – 368 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ